ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 17 (3473) ● ● СУБОТА, 14 МАЯ, 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Новая вясна "Дударыкаў"**

Заслужаны аматарскі калектыў Беларусі, які толькі за апошнія 5 гадоў атрымаў на фэстах і конкурсах у розных краінах дзевяць Гран-пры, адсвяткаваў 45-годдзе Стар. 2



**Радасць нараджэння кнігі**

Паэзія ўраджэнца Рыгі Яўгена Голубева, які лёсам і сваяцтвам цесна спалучаны з Беларуссю, зачароўвае ўсіх сваёй шчырасцю Стар. 3



**Мастоўскі вандроўнік**

Іосіф Лісай аб'ездзіў на ровары ўсю Еўропу, пабываў за Палярным кругам Стар. 4

ТРАДЫЦЫІ

# Валачобнікі прыйшлі!

У старадаўнім Велікодным абрадзе, які ўзнавілі ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах, паўдзельнічалі і фальклорныя гурты з Казахстана ды Літвы

**Кацярына Мядзведская**



МАРЫНА ВАРАБЕЙ

**Валачобнікам на Вялікдзень рады ў кожнай хаце**

"Вялік святы нам дзень настаў..." — запявалі валачобнікі з аўтэнтычных гуртоў Віцебшчыны "Васілёчкі" ды "Сунічкі". Далучаліся да спеваў і хлопцы з моладзевых фальклорных гуртоў "Тала-ка", "Раме", "Страла", "Рада Явар" ды іншых. Паўдзельнічалі ва ўнікальным Валачобным абрадзе беларусаў і гурты "Айна-коль" з Казахстана і "Kaukoras" з Літвы.

Сёлета на Вялікдзень у Строчыцах, нягледзячы на дождж і хмары, было шматлюдна. Прычым госці прыехалі з розных краін. А рэканструкцыя Валачобнага абраду з абыходам вёскі была практычнаю часткай X Міжнароднай канферэнцыі "Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, услрымання". Праходзіла яна ў Белдзяржуніверсітэце культуры і мастацтваў, сабрала спецыялістаў з дзевяці краін. Як расказваў мне намеснік дырэктара Музея архітэктуры Аляксандр Ісакаў, Валачобніцкі абрад быў раней вельмі папулярны ў беларускіх вёсках. Праводзіўся пераважна ў Паўночнай, Паўночна-заходняй і Цэнтральнай Беларусі, а таксама ў прылеглых раёнах польскага Падляшша, у Віленскай, Пскоўскай, Смаленскай абласцях, часткова і ў Калужскай, Арлоўскай, Чарнігаўскай. Сёння ж традыцыя тая амаль забытая...

Спецыялісты заўважылі: абрад Валачобніцтва мае нешта агульнае з Калядамі. Як пад Новы год калядоўшчыкі, так і ў Велікодную ноч валачобнікі хадзілі па хатах, спевамі славілі гаспадароў, збіралі пачастункі. Аднак, у адрозненне ад калядоўшчыкаў, валачобнікі — гэта толькі мужчыны сярэдніх гадоў і маладыя хлопцы. Зрэдку да іх далучаліся старыя ды замужнія жанчыны, а дзяўчаты і дзеці — не ўдзельнічалі зусім. Пэўна, што валачобнікі ўвасаблялі тую вясновую, "ярую" мужчынскую сілу, Дух абнаўлення, які дае працяг новаму жыццю. Дарэчы, ніколі не было сярод валачобнікаў і ражаных, а вось музыкі — абавязкова.

На Беларусі спрадвечныя звычаі продкаў, язычніцкія па сваёй сутнасці (а гэта — пакланенне Сонцу, Агню, Вадзе, Зямлі, адухаўленне сілаў Прыроды) выжылі пад націскам абрадаў, традыцый пазнейшых, хрысціянскіх. У велікодных абрадах захаваліся і багатая спадчына Валачобніцкіх спеваў: некаторыя з іх гучалі ў Строчыцах. За асновы валачобніцкага абраду, які аднаўлялі на тэрыторыі Музея архітэктуры, спецыялісты ўзялі Велікодныя традыцыі з былога Себежскага павета Віцебскай губерні. Там, па словах Аляксандра Ісакава, адорваць валачобнікаў было прынята праз акно. І гаспадары на Вялікдзень заўсёды чакалі іх прыходу — як жаданых і благаслаўлёных гасцей, як пасланцоў Неба. Бо верылі (ці ведалі?): ад іх візіту, як ад дыхання Усявышняга, залежыць здароўе, лад, дабрабыт у хаце, гаспадарцы — бо ўсе ж мы Яго часцінкі. Таму і адорвалі валачобнікаў шчодра: фарбаванымі яйкамі, салам, пірагамі, грашыма... Лічылася: гэта якраз сабе тым самым гаспадары забяспечваюць багацце і поспех на ўвесь год. → Стар. 4

ВЕСТКІ

## Дзякуй за мір!

**Аддаць даніну памяці загінулым салдатам Вялікай Айчыннай вайны ў Аляксандраўскі сад у Маскве прыйшлі ветэраны, палітыкі, дыпламаты, прадстаўнікі беларускай дыяспары**

Да Магілы Невядомага Салдата ўскладзены вянок ад Пасольства Беларусі ў Маскве. Урачыстая цырымонія прысвячалася 71-й гадавіне Перамогі. У ёй прынялі ўдзел Пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, ветэраны Вялікай Айчыннай, расійскія парламентарыі, прадстаўнікі інтэграцыйных органаў, беларускай дыяспары і дыпламаты. Кветкі былі ўскладзены і да памятных знакаў "Горад-герой Мінск" і "Брэсцкая крэпасць-герой": на Алеі гарадоў-герояў у Аляксандраўскім садзе. Урачыстая цырымонія завяршылася праходжаннем роты ганаровай варты і ваеннага аркестра.

"Не выпадкова мы аддаем даніну памяці загінулым салдатам Вялікай Айчыннай ля Магілы Невядомага Салдата, — казаў у размове з журналістамі Ігар Петрышэнка. — Ні ў якім разе нельга забываць тых, хто, ахвяруючы жыццём, абараняў родную зямлю". Пасол нагадаў, што перамога далася савецкаму народу вялікай цаной. "Менавіта ля Магілы Невядомага Салдата выразна разумееш: не існуе нічога больш каштоўнага, чым мір", — адзначыў ён.

А ў Дзелавым і культурным комплексе беларускага Пасольства ў Маскве да Дня Перамогі адкрылася выстава "Непакораная Беларусь" Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У экспазіцыі — дакументы і фатаграфіі, падпольны партызанскі друк, асабістыя рэчы ўдзельнікаў вайны. Экспануюцца прадметы, знойдзеныя на месцы лагера смерці "Трасцянец".

ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ

# Аляксандр Гаравец і іншыя

**Іван і Валянціна Ждановічы**

**"Где же вы теперь, друзья-однополчане?.." — спявалі раней па ўсёй вялікай краіне. Песня была папулярнай яшчэ і таму, пэўна, што ў многіх савецкіх сем'ях доўга чакалі з вайны родных, што прапалі без вестак...**

У пасляваенным вершы "У родных мясцінах" Якуб Колас, які ў час вайны страціў сына Юрку і жонку, заўважае: "Дубоў маіх паменшылася раць,/ Як і людзей у родным нашым краі". Куды падзеліся? Адны — самі паўміралі, "Другіх вайна ў далёкі свет пагнала,/ І многа іх не вернецца назад;/ А трэціх вынішчыў, пабіў фашысцкі кат,/ І родная зямля іх не прыбрала". Між тым у Песняра за радком пра "другіх" хаваўся і боль за роднага брата Міхася. Той пад час нямецкай акупацыі працаваў інспектарам беларускіх школ на Стаўбцоўшчыне, у 1944-м падаўся на Захад. Памёр Антось Галіна (такім быў яго літаратурны псеўданім) у 1991 годзе ўвосень, на 95-м годзе жыцця, у ЗША… Дома не пабываўшы.

Пасля вайны падлічвалі страты. А як было "аформіць" таго ж Міцкевіча: як "прапаўшага без вестак"? Ну не здраднік жа… З палону нямецкага быццам бы і вярнулася больш за 1 мільён 800 тысяч (!) грамадзян СССР — звесткі Мінабароны Расіі з прэсы за 2011 год. Аднак многіх пасля вызвалення, "фільтрацыі" адправілі не дадому — саслалі "адпрацоўваць віну" перад народам у шахты Данбаса, на ўранавыя руднікі... Па "местам не столь отдаленным" і аселі дзясяткі тысяч беларусаў. Вестак пра іх у БССР, пэўна, і не збіралі, страты на вайну спісалі. А маркоі ж было, калі ў 80-я стварылі па ўсіх раёнах кнігі "Памяць". Вялікую справу рабілі: праца ў архівах, рух юных следапытаў, пошукавыя атрады, удакладненне звестак... І ўзнікала шмат "пытанняў". Ідэалагічнае "сіта" старанна прасейвала матэрыялы: каб ворагі не трапілі ў героі… Яшчэ і цяпер далёка не ўсё падлічана.

Калі распаўся Саюз, большасць ваенных архіваў засталася ў Расіі. Хто сёння скажа, і як падлічыць: колькі беларусаў, ураджэнцаў Беларусі вызвалялі, напрыклад, Польшчу? Колькі там нашых, беларусаў (не проста савецкіх салдат), палегла? А ў Чэхаславакіі, Венгрыі, Румыніі, краінах Прыбалтыкі?.. Колькі адтуль суплеменнікаў не вярнулася! А гінулі ж беларусы і ў Францыі (пра тое Раман Ярохін напісаў аповесць "Девченки наши за Верденом"), Італіі (і не толькі пад Монтэ-Касіна), у вайне з Японіяй… → Стар. 3



**Лётчык Аляксандр Гаравец**

ТАЛЕНТЫ

# Новая вясна “Дударыкаў”

## Заслужаны аматарскі калектыў Беларусі, які толькі за апошнія 5 гадоў атрымаў на фэстах і конкурсах у розных краінах дзевяць Гран-пры, адсвяткаваў 45-годдзе

**Іван Ждановіч**

У чым сакрэт працяглага, надзіва плённага творчага жыцця фальклорнага гурта “Дударыкі”? Ён, нагадаем, быў створаны ў 1970-71 навучальным годзе на базе адной з мінскіх школ. Аддадзім належнае яго стваральніку і мастацкаму кіраўніку, ураджэнцу песеннай Капыльшчыны Дзмітрыю Ровенскаму, цяпер ужо заслужанаму дзеячу культуры Беларусі, выдатніку адукацыі. Гэта яго ды аднадумцаў намаганнямі гурт, які ўпрыгожвае культурнае жыццё 14-й мінскай гімназіі (а шырэй — і Мінска, і Беларусі, і свету…) не разваліўся, не распаўся — гожа адсвяткаваў сваю новую вясну. Удакладнім: на вокладцы святочнага буклета, які падораны і нашай рэдакцыі, побач з Ровенскім значацца і хормайстар Галіна Мішчанка, і балетмайстар Вера Варашылава. Акрамя іх, на адным з разваротаў бачым іншых настаўнікаў, што дапамагаюць раскрывацца юным талентам: касцюмер Лідзія Ровенская, выкладчыцы па класу цымбал Людміла Сакалова і Лаліта Ровенская, выкладчыцы па класе народных духавых інструментаў Яна Загумёнава і Аксана Ровенская, выкладчыца па класе скрыпкі Ірына Чаюкова. Другі складнік поспеху, на мой погляд: што гурт увесь час сілкуецца з крыніц народнай творчасці. Трэці: што ні год, то ідзе натуральнае абнаўленне ў шэрагах дударыкаўцаў. Ну і, вядома ж, усім родзічам-сваякам, прыхільнікам творчасці самадзейных артыстаў, у тым ліку і ў розных структурах улады, варта сказаць: вялікі дзякуй!

Мы расказвалі ўжо пра значныя міжнародныя праекты з удзелам як маэстра Дзмітрыя Ровенскага (асабліва ўдала складваецца ў яго стасункі з новасібірскімі беларусамі), так і ўсяго гурта: адно выступленне “Дударыкаў” у Штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы ў 2014-м чаго вартае! Цікавыя старонкі з жыцця гурта згадваліся і на юбілейным святочным канцэрце ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода. Пад час урачыстасці Дзмітры Ровенскі быў ушанаваны нагрудным знакам “За ўклад у развіццё культуры Беларусі”. У нэце з’явіліся цёплыя водгукі пра канцэрт гурта, які не раз быў удзельнікам, пераможцам шматлікіх конкурсаў і фэстаў. Безумоўна, “сваёй дзейнасцю гурт спрыяе захаванню і пашырэнню традыцыйнай беларускай музычнай культуры”. Не менш важна і тое, што, прайшоўшы прыгожую школу гурта, сотні сталічных школьнікаў, а ў новым часе і гімназістаў атрымліваюць моцную “прышчэпку” беларускага духу. Як вядома, народная музыка, спевы, танцы, строі, а найперш сама ўжо мова беларуская неўпрыкмет робяць неацэнную працу ў юных душах — і яны ўзвышаюцца, прасвятляюцца ў плыні народнай культуры. Мяркую, пад час канцэртнай праграмы не толькі госці свята змаглі атрымаць асалоду ад народных песень і танцаў, паслухаць найгрышы на традыцыйных беларускіх інструментах — а што і самім дударыкам, іх старэйшым сябрам працэс дзівоснага тварэння свята, прыгажосці па-ранейшаму да душы.



Дзмітры Ровенскі — стваральнік і кіраўнік “Дударыкаў”



Мелодыя народная, сэрцу блізкая…

Прыглядзімся: што было ў юбілейным рэпертуары гурта? Можа тое цікава будзе і для актывістаў беларускіх суполак замежжа — гурт “Дударыкі”, сам Дзмітры Ровенскі ды яго памочнікі адкрытыя для кантактаў, супрацы. Часта, дарэчы, і гасцей сустракаюць, у тым ліку і з замежжа, у гімназіі, дзе з 2003 года дзейнічае Музей народных музычных інструментаў: там больш за 350 экспанатаў больш чым 60-і назваў! Прычым кожны з удзельнікаў гурта паступова асвойвае некалькі з іх. Усяго юбіляры паказалі 23 нумары, у тым ліку вакальна-харэаграфічную кампазіцыю “Рушнічок”. 3 танцаў адзначым Крутуху, Прысюды, польку “Ку-ка” (пастаўлена з удзелам Міколы Котава), Вясковыя замалёўкі. Хораша гучалі найгрышы ў апрацоўцы Уладзіміра Грома (стваральніка знакамітага гурта “Крупіцкія музыкі”): “Чэрніцкія найгрышы”, вальс “Спатканне” (выконваў ансамбль акарын), “Віцебскі вальс”, “Крупіцкая полька”. Яшчэ з найгрышаў у праграме — “Танец” (з “Полацкага сшытка”, які цяпер называецца “Астрамечаўскі рукапіс”. — **Рэд.**), “Баранавіцкая полька”, “Народныя вальсы”, “Цыганачка”, “Ай да-рай-да” (беларуская вясельная музыка), “Ліцвіны” (граў ансамбль дудароў), “Смаргонская кадрыля”. А “Выкрунтасы на бубнах” — то музычна-харэаграфічная кампазіцыя. Гучалі й песні — як народныя (“Па лужках”, “Вяснянкі”), так і сучасных аўтараў: добра вядомая ўжо і ў замежжы “Брат-ка-беларус”, “Дарагая мая Беларусь”, “Юбілейныя “Дударыкі”.

У праграме свята чытаем: “За сорак пяць гадоў ансамбль даў каля 1900 канцэртаў, у тым ліку каля 550 за мяжой. “Дударыкі” прадстаўлялі культуру Беларусі ў некалькіх дзясятках краін, у тым ліку на астравах Тайвань і Джэрсі, у Партугаліі, Шатландыі, Германіі, Францыі, Паўднёвай Карэі ды іншых. Толькі ў Італіі былі 11 разоў. За апошнія 5 гадоў “Дударыкі” атрымалі на фэстах і конкурсах у розных краінах 9 Гран-пры”. А ў шыкоўным буклеце ў акравершах (віват невядомаму паэту!) ушанаваны асноўныя музінструменты, на якіх граюць юныя артысты, пададзена шмат цікавых фактаў, прыгожых фотаздымкаў з розных гадоў. І нават ушанаваны, са здымкамі, лепшыя майстры Беларусі па вырабе народных музычных інструментаў. Так што, калі разабрацца, аматарскі па сутнасці гурт даўно ўжо стаў жывым стрыжнем своеасаблівай Народнай акадэміі, у якой клапатліва зберагаюцца, выкарыстоўваюцца і штогод прымнажаюцца багатыя традыцыі народнай музычнай, спеўнай, танцавальнай культуры.

ПЛАНЕТА ЛЮДЗЕЙ

# Барысаў, Нарва, Івангорад



**На святочнай сцэне ў Нарве — артысты з Беларусі, Расіі ды Эстоніі**

**Па ініцыятыве Нарвскага беларускага таварыства “Сябры” ў Эстоніі цікава адзначылі Сусветны дзень Параднёных гарадоў**

Свята гэтае — не новае ў календары: Сусветны дзень Парадзнёных гарадоў адзначаецца ў апошнюю нядзелю красавіка з 1957 года. А мы вырашылі, што трэба надаць руху гарадоў-пабрацімаў новы імпульс. І правялі ў Нарве шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных святу. Праект, які пры фінансавай падтрымцы Фонду інтэграцыі ды міграцыі “Нашы людзі”, аддзела культуры Нарвы рухала суполка “Сябры”, меў назву “Дружба без межаў”. Паўдзельнічалі ў ім і прадстаўнічыя дэлегацыі з гарадоў-пабрацімаў Нарвы: беларускага Барысава і расійскага Івангорада.

Напярэдадні свята у Цэнтральнай бібліятэцы Нарвы мы размясцілі стэнд з цікавай інфармацыяй пра гарады Барысаў, Нарва, Івангорад. Там жа можна было пагартаць нумары газеты “Голас Радзімы”, атрымаць весткі пра санаторыі Беларусі, турпаездкі на нашу Бацькаўшчыну. Стэнд “працаваў” амаль тры тыдні. А сарцавінай праекта стала ўрачыстасць у Палацы культуры “Ругодив”, якая прайшла 23 красавіка. У вестыбюлі мы разгарнулі невялікую выставу: прыгожыя вышыўкі сяброўкі беларускай суполкі Ганны Пярсіцкай. У палацы мы правялі круглы стол — абмяркоўвалі, як лепш ладзіць культурнае ўзаемадзеянне гарадоў-пабрацімаў. У размове ўдзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў культуры Эстоніі ды Беларусі, Пасол Беларусі ў Эстоніі Анатоль Сцепусь, іншыя адказныя асобы, прадстаўнікі мэрый Барысава, Івангорада і Нарвы. Ад Барысава — Людміла Гарнак, ад Івангорада — Марына Волкава ды віцэ-мэр Нарвы Вячаслаў Канавалаў распавялі пра свае гарады, сумесныя дзеянні ў сферы культуры.

Пасол Анатоль Сцепусь падзяліўся планамі беларускага боку ў Эстоніі на 2016 год, аб’яўлены, як вядома, у Беларусі Годам культуры. Ужо ў траўні ў Йыхві — дзе адбудзецца фестываль балету — пройдуць гастролі Нацыянальнага акадэмічнага Тэатра оперы і балета Беларусі. У Таліне на працягу года будуць дэманстравацца кінастужкі студыі “Беларусьфільм”. Да Дня незалежнасці Беларусі прымеркавана адкрыццё выставы “Мы — беларусы!”, якая адлюстроўвае жыццё беларусаў у розных краінах. Выстава пройдзе ў розных гарадах Эстоніі. Прыемна было нам пачуць: 20 красавіка ў Мінску падпісана пагадненне, якое палягчае ўезд і знаходжанне грамадзян Эстоніі ў Беларусі. Як сімвалічны знак падзякі за такія клопаты прысутны на сустрэчы дырэктар Мастацкай школы Генадзь Курлянкоў падарыў паслу дзве свае карціны для перадачы ў дар музею горада яго дзяцінства — Магілёву.

Вялікі канцэрт на галоўнай сцэне Палаца культуры адкрылі мужчынскі ансамбль эстонскага таварыства “Juhhaidi” ды арганізатары: ансамбль беларускай песні нарвскай суполкі “Сябры”. 3 песнямі, духмянымі караваямі сустрэлі мы творчыя калектывы з пабрацімскіх гарадоў: ансамбль народнай музыкі і песні “Траецкія музыкі” з Барысава і танцавальны калектыў “Забавушка” з Івангорада. Гледачы атрымалі асалоду ад народных і сучасных песняў у выкананні “Траецкіх музыкаў”, не шкадавалі апладысментаў. І танцоркі-расіянкі заслужылі авацыі залы. На завяршэнне імпрэзы госці з Беларусі і нарвскія “Сябры” разам выконвалі вясёлую беларускую песню, абменьваліся памятнымі падарункамі. Было шмат і ганаровых грамат, кветак, цёплых сяброўскіх слоў.

На другі дзень, 24 красавіка, у Цэнтры культуры Кохтла-Ярве беларускія артысты далі канцэрт для жыхароў Йыхві і Кохтла-Ярве. Дарэчы, 22 красавіка яны выступалі і ў расійскім Івангарадзе. Вось так мы разам з супляменнікамі ўмацоўваем культурныя сувязі паміж рознымі народамі: бо народная дыпламатыя, як вядома, не мае межаў.

**Віктар Байкачоў,** намеснік старшыні суполкі “Сябры”

**ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ**

# Аляксандр Гаравец і іншыя



ІВАН ЖДАНОВІЧ

Тацццяна Баканава

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Між тым прапасці без вестак на вайне было вельмі проста, асабліва на перадавой ці занятай ворагам тэрыторыі. У “зону невядомасці” часта траплялі лётчыкі: не вярталіся з задання. Знікалі нават Героі Савецкага Саюза. Сярод прапаўшых 14 гадоў лічыўся і лётчык-беларус Аляксандр Гаравец. Летась, наведваючы Мемарыял “У гонар герояў Курскай бітвы” ў Белградскай вобласці Расіі, мы ўбачылі ў экспазіцыі фота: бронзавы бюст Героя. З подпісам, што ўстаноўлены “на месцы гібелі лётчыка на 597-м кіламетры трасы “Масква—Сімферопаль”. Гэта пад Белградам: Іўнянскі раён, вёска (ці хутар) Зорынскія Двары. Многія пра Гараўца чулі, як і пра лётчыка, двойчы Героя Сяргея Грыцаўца (родам з Баранавіцкага раёна Брэстчыны, ваяваў у Іспаніі, на Халхін-Голе, а загінуў у верасні 1939-га): іх часам і блытаюць, бо прозвішчы падобныя. Нагадаем, Гаравец здзейсніў подзвіг 6 ліпеня 1943 года, на другі дзень знакамітай Курскай бітвы (яна доўжылася 50 дзён і начэй). Будучы герой нарадзіўся 12 сакавіка 1915 года ў вёсцы Макшаны ў сялянскай сям'і — цяпер Сенненскі раён Віцебшчыны. Пасля сямі класаў вучыўся ў Лясным тэхнікуме Полацка (1930-31), служыў у арміі, а ў 1935-м закончыў Ульянаўскую лётную школу. Працаваў інструктарам аэраклуба ў горадзе Шахты Растоўскай вобласці. У вайну служыў на Паўночна-Каўказкім і Варонежскім франтах, быў намеснікам камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка. Здзейсніў 74 баявыя вылеты, знішчыў 11 нямецкіх баявых самалётаў асабіста і 6 у складзе групы, іншую тэхніку ворага.

Навуковая супрацоўніца Мемарыяла Тацццяна Баканава расказала нам: менавіта беларус Аляксандр Гаравец за ўсю вайну з усіх савецкіх лётчыкаў атрымаў у адным баі найбольш паветраных перамог. Так складіся абставіны, што ён уступіў у бой супраць 20-і варожых бамбавікоў, 9 з іх збіў. Цяпер лічбы праправяраюць, ды тое не адмаўляе подзвігу! Пасля бою лётчык не вярнуўся на базу: лічыўся прапаўшым без вестак. Кіраўніцтва авіяпалка пахадайнічала, і “за бяспрыкладны подзвіг, здзейснены ў апошнім баі, Указам Прэзідыума ВС СССР ад 28 верасня 1943 года Аляксандр Канстанцінавіч Гаравец удастоены звання Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля “Залатая Зорка”. І толькі ў кастрычніку 1957-а жыхары Зорынскіх Двароў знайшлі самалёт з парэштакмі лётчыка. І яшчэ пісталет ТТ, партбілет, планшэт с картаю, пасведчанне асобы... Па дакументах і ўстанавілі, хто загінуў. Героя пахавалі пры вёсцы, а на месцы гібелі ўстанавілі бюст. Тацццяна Баканава казала: раней у Цэнтральным музеі Узброеных Сіл СССР, у Маскве, Гараўцу прысвячаўся цэлы стэнд. Быў выстаўлены яго самалет Ла-5, гарматы ды кулямёты — у іх не было ніводнага снарада ці патрона: герой усе расстраляў у апошнім баі...



На самалёце Ла-5 ваяваў Аляксандр Гаравец

Тацццяна Баканава даслала ў рэдакцыю інфармацыю і ўнікальныя фотаздымкі, якія сведчаць пра ўшанаванне памяці Героя Аляксандра Гараўца на Белградчыне. Паводле тае інфармацыі, партбілет, пісталет, ордэн Чырвонага Сцяга, знак Гвардыя, кулямет з самалёта Ла-5, знойдзеныя на месцы гібелі Героя, цяпер — у Музеі ваеннай авіяцыі ў Моніна (Падмаскоўе). На здымках, зробленых прыкладна ў 1959-60 годзе (адразу пасля перазахавання Героя) відаць упрыгожаная кветкамі, вянкамі магіла, ёсць сярод жыхароў Зорынскіх Двароў і жонка, і дачка лётчыка. Паводле некаторых звестак, жонку звалі Валянціна, а дачку — Інга. Здымак з пазнейшых падпісаны: “Казакоў і сёстры Гараўца ля помніка Герою”. А як скаліся іх лёсы, ці жывыя родзічы лётчыка?



Бюст Героя ў Полацку

Чаму тут загаловак “Аляксандр Гаравец і іншыя”? Бо “іншых” беларусаў было — сотні тысяч! Тых, што не вярнуліся з вайны. Што прапалі без вестак, што сустрэлі Перамогу на чужыне... Варта памятаць пра гэта. Кажуць: ва Усявышняга ніхто не прападае. То хай і на зямлі Беларускай будзе так, як на Небе...

**ВЕСТКІ**

## Юбілей у Іркуцку

**Супляменнікі з Прыбайкалля праводзяць вялікі “Беларускі кірмаш-2016”: для таго ёсць добрая нагода**

Шанаваць традыцыі — гэта ў крыві беларусаў. З Іркуцка Алег Рудакоў, актывіст беларускага руху, напісаў у рэдакцыю: 20 гадоў таму — 23 лютага 1996 года — адбылося пасяджэнне аргкамітэта па правядзенні Першага з'езду беларусаў Прыбайкалля. Пазней, 31 мая, прайшоў з'езд. “З гэтай нагоды Іркуцкі моладзевы клуб “Крывічы” запрашае ўсіх сяброў адзначыць юбілей разам: давайце збяромся на “Беларускі кірмаш-2016”, які пройдзе ў горадзе 29 мая”, — запрашае Алег. Каб паказаць, як гэта прыгожа, раіць паглядзець леташнія здымкі на ягонай старонцы ў Фэйсбуку.

Сёлетні кірмаш прысвечаны і 355-годдзю Іркуцка. Праводзіцца клубам “Крывічы”, з падтрымкаю абласных і гарадскіх уладаў. Мэта: “адраджэнне, зберажэнне і развіццё духоўных і культурных каштоўнасцяў Беларускага народа ў Прыбайкаллі”. Гэта агледзіны жыцця-быцця-творчасці беларускіх творчых гуртоў Іркуцка і вобласці. Арганізатары адзначаць яркіх, таленавітых выканаўцаў, што рухаюцца ў плыні традыцыйнай беларускай культуры. Прытым жыхары і госці горада змогуць пераканацца, наколькі ўнікальная культура беларусаў. “Кірмашы здаўна — гэта і знаёмствы, сустрэчы, зносіны… — упэўнены Алег Рудакоў. — І наш паспрыяе таму, каб аб'ядноўваліся беларусы, іх нашчадкі ў Іркуцкай вобласці. Каб ладзілася пераемнасць нашых духоўных, культурных традыцый маладымі хлопцамі і дзяўчатамі. І яшчэ кірмаш — гэта магчымасць падтрымаць творчыя гурты, асобных выканаўцаў, што маюць інтарэс да беларускіх традыцый”.

**КОЛА СЯБРОЎ**

# Радасць нараджэння кнігі

**Паэзія ўраджэнца Рыгі Яўгена Голубева, які лёсам і сваяцтвам цесна спалучаны з Беларуссю, зачароўвае ўсіх сваёй шчырасцю**

“Следов пленительная грусть” — так названа ўжо дзясятая па ліку кніга Яўгена Голубева. Зборнік пабачыў свет у Даўгаўпілсе. Радасць яго нараджэння падзялілі з аўтарам сябры з Беларускага культурна-асветніцкага таварыства “Уздым” і шматлікія госці ў даўгаўпілскім Цэнтры беларускай культуры. Прэзентацыя зборніка была і паэтычнаю вечарынай. Адкрыла яе дырэктарка ЦБК Жанна Раманоўская. Распавяла пра аўтара, які — паэт, гісторык-краязнаўца. Член Саюза пісьменнікаў Расіі, Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў, кіраўнік асацыяцыі творчай інтэлігенцыі Даўгаўпілса DINA-ART. Аўтар зборнікаў вершаў і кніг для дзяцей. Публікуецца ў СМІ Латвіі, Расіі, Беларусі, Балгарыі. Яго творы перакладзены на беларускую, нямецкую, балгарскую, латышскую і латгальскую мовы. У часопісе “Капитал регион” выходзяць гістарыяграфічныя матэрыялы Яўгена Голубева пра вядомыя дваранскія роды Латгаліі, якая, нагадаем, раней была тэрыторыяй Віцебшчыны, таму і беларускія даследчыкі знойдуць у іх шмат цікавага.

І паэтам Яўгена Голубева, прызнаецца ён, зрабіла Беларусь. Нарадзіўся ў Рызе ў 1950-м, скончыў ваеннае вучылішча, а служыць па размеркаванні прыбыў у беларускі горад Баранавічы. Менавіта там наведваў літгуртко, якім кіраваў паэт Юрый Багданаў. Яго парады і дапамаглі рыжаніну адчуць смак слова, усвядоміць свой дар. А першыя вершы афіцэра апублікаваны ў 1970 годзе. У Баранавічах ён сустрэў зямную сваю музу Зінаіду: яны разам ідуць па жыцці, выхавалі траіх сыноў. З гадамі афіцэр скончыў гістфак Даўгаўпілскага педінстытута (1980) і ваенна-педагагічны факультэт Ваенна-палітычнай акадэміі (1989). 25 гадоў праслужыў у ВПС СССР. З 1991-га жыве і працуе ў Даўгаўпілсе. Шмат гадоў Яўген Голубеў — актывіст суполкі “Уздым”. У прадмове да тэкстаў у зборніку “А водар Радзімы ўсё кліча і кліча” Лявон Шакавец напісаў: “Яўген Голубеў лёсам і сваяцтвам цесна спалучаны з Беларуссю, пра якую са шчырай прыязнасцю піша ў сваіх вершах. Яго паэзія камерная, светлая і меладычная”. Чытачам знаёмы і яго публіцыстыка, палемічныя нататкі, нарысы, апавяданні, тэксты ў іншых жанрах. У 2012-м проза Яўгена Голубева ўвайшла ў міжнародны зборнік “Руская проза XXI стагоддзя”.

З нараджэннем кнігі аўтара павіншаваў консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Дзмітрый Канстанцінаў. А Яўген Георгіевіч распавёў, як ствараўся зборнік: у асноўным з вершаў 2009-2014 гадоў, якія раней не публікаваліся. Прачытаўшы некалькі з іх, паэт прадставіў рэдактара зборніка: Ірыну Страздоніка-Плячко. Іх сумесная праца доўжылася амаль паўгода, некаторыя вершы не раз перарабляліся. Бывала, ад вялікага заставалася пару радкоў. Ірына — член рускай пісьменніцкай арганізацыі Латвіі. Тонка адчувае гучанне слова, яго сэнс і месца ў радку, улоўлівае рытмічны малюнак.

Выступы аўтара чаргаваліся з вітаннямі гасцей. Душэўна і пранікнёна свае песні на вершы Яўгена Голубева праспявала пад гітару даўгаўпілскі бард Алена Віткевіч. Былі песні і лірычныя, і жыццёва-філасофскія, усім легла на душу песня “Трамвайчык”: з нечакнадрагелістым сюжэтам, але кранае тонкія струны душы. Гэты верш аўтар, прызнаўся, напісаў у трамваі, пакуль праехаў некалькі прыпынкаў. Паэт, бард і сябар Анатоль Бойка — яны даўно знаёмыя — чытаў вершы аўтара пад музыку, нібы прапяваючы радкі, і ў тым была свая прыгажосць. Бо вершы пад музыку ўспрымаліся па-іншаму, агаляліся новыя вобразы, сэнсы, рытмы. Такое чаргаванне “прастачытання” вершаў, ахутвання іх музыкай, выкананне песень пад гітару — усё гэта і стварала ў зале асаблівую, душэўную атмасферу.



Яўген Голубеў і Жанна Раманоўская

Цікава распавядаў паэт пра тое, як шукаў заключны верш для кнігі. У галаве, казаў, круціўся радок: “Что найти ты в этой жизни хочешь?”, а працягу не было. І рэдактар Ірына прапанавала свае чатыры радкі, далей Яўген дадаў свае. Так і з'явіўся фінал. Верш разам, кожны свае радкі, чыталі абодва аўтара. Вельмі сімвалічная вокладка зборніка: постаць чалавека на зрэзе дрэва. Гэта ж і зрэз чалавечага жыцця, у якім усё рухаецца па крузе. Тут мінулае — гэта светлыя палосы, а будучыня — цёмныя: яна пакуль невядомая. Нам не дадзена ведаць, што чакае наперадзе. А дызайнер вокладкі — малодшы сын паэта Аляксандр.

У канцы вечарыны Яўгена Голубева і яго жонку Зінаіду з нараджэннем кнігі віншавалі госці, сябры паэта, калегі: кіраўніца суполкі “Уздым” Людміла Сінякова, Фаіна Осіна, Анастасія Сазанкова, Павел Плотнікаў, Людміла Вілюма і Яўхіхій Канаплёў, Валеры Ермачэнка, Анатоль Харын, Уладзімір Врэтас, Валянціна Абушкевіч ды іншыя. Паэт падзякаваў кіраўніцтву Даўгаўпілскай гардумы і асабіста віцэ-мэру Янісу Дукшынскаму за дапамогу і падтрымку ў выданні зборніка, а таксама Цэнтру беларускай культуры, яго кіраўніцы Жанне Раманаўскай за дапамогу ў арганізацыі і правядзенні вечарыны, а ўсім, хто быў у зале — за ўвагу да яго творчасці. Госці доўга не разыходзіліся, за кубкам гарбаты абменьваліся ўражаннямі, размаўлялі, фатаграфаваліся. Так што “дзень нараджэння кнігі” атрымаўся светлым і цёплым, добрым і мудрым, кранальным і душэўным, праўдзівым і “неназидательным”, шчырым — як і самі вершы Яўгена Голубева.

**Марыя Памецька,**
метадыст Цэнтра беларускай культуры, член суполкі “Уздым”, г. Даўгаўпілс

ТРАДЫЦЫІ

# Валачобнікі прыйшлі!

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Пад час Вялікоднага свята ў Строчыцах ладзіліся і традыцыйныя для гэтай пары беларускія гульні ды танцы. А ў Спаса-Праабражэнскай царкве прайшла прэзентацыя абраза "Уваскрасенне": бо і хрысціянскую традыцыю беларусы шануюць, і народныя звычаі пад яе падладжваюць.

А перад тым, як далучыцца да Валачобніцкага абрада ў Строчыцах, удзельнікі канферэнцыі пабывалі на канцэрце "Фальклор беларускай глыбінкі" — ён ладзіўся ў Мінску. Выступілі гурты з Гродзенскага, Воранаўскага, Ушацкага і Любанскага раёнаў. Ладзіліся таксама майстар-класы народных майстроў, праходзіла этнадыскатэка Folk-Prime. І навуковая частка канферэнцыі была вельмі змястоўнаю: спецыялісты дзяліліся меркаваннямі наконт таго, як абудзіць цікавасць да фальклору, народных традыцый у сэрцах і розумах сучасных студэнтаў. Разважалі, чаму так важна вывучаць традыцыйную культуру свайго народа, і чаму так важна яе ведаць усім сучасным людзям — не толькі спецыялістам.

Як адзначыў на канферэнцыі Віктар Языковіч, прарэктар па навуковай рабоце Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў, цяпер, калі вывучаецца аўтэнтычны фальклор, то акцэнт робіцца на комплексным і сістэмным вывучэнні розных яго праяў. Спецыялісты, у прыватнасці, аналізуюць: як інтэгруецца ён у мастацкія і адукацыйныя рэаліі сучаснасці? Пры тым важна, што ў фальклорным руху ўдзельнічае і моладзь. Таму выкладчыкі ўніверсітэта, найперш з кафедры этналогіі ды фальклору, імкнуцца пашыраць кола такіх энтузіястаў. І, як бачым, на прыкладзе Валачобніцкага абраду ў Строчыцах, ім гэта ўдаецца!

**Дарэчы**. Сёлета ўпершыню пасля доўгага перапынку Валачобніцкі абрад правялі жыхары вёскі Ігнаткаўцы, што ў Лідскім раёне Гродзеншчыны. Праўда, мужчын сярод валачобнікаў не было, а толькі жанчыны — спявачкі з творчага гурта "Ігнаткаўскія весялухі". Аднак энтузіясткі вераць: у наступны раз абавязкова далучацца да іх і хлопцы!



МАРЫНА ВАРАБЕЙ

**Валачобнікі з музыкай ды спевамі абыходзяць звычайна ўсю вёску**



**На Вялікдзень у Строчыцах — святочны настрой**

ВЕСТКІ

## Сіла паэзіі

**Актыўна разгортвае працу ў беларускай медыяпрасторы агенцтва навін Sputnik-Беларусь/Belarus**

СМІ паведамлялі ўжо: 7 красавіка ў Мінску мультымедыйны прэс-цэнтр Sputnik Беларусь (у Доме Масквы па вул. Камуністычнай, 86) афіцыйна адкрылі гендырэктар МІА "Россия сегодня" Дзмітрый Кісялёў і Міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч. Гэта, гаварылася на ўрачыстасці, будаўніцтва стратэгічнага інфамоста паміж Масквою і Мінскам, іншымі сталіцамі свету, паколькі прадстаўніцтвы агенцтва ёсць у дзясятках краін. Мультымедыйны прэс-цэнтр мае ўнікальныя тэхнічныя магчымасці.

Мы пісалі ўжо пра цікавы паэтычны праект Sputnik.Чтения. Пачытаць вершы, паразважаць пра месца паэзіі ў жыцці журналісты прапанавалі прадстаўнікам дзяржаўнай улады, мастацтваў, сферы культуры, спорту. Прэс-служба інфармагенцтва паведаміла: праект завяршаў кіраўнік Sputnik-Беларусь/Belarus Андрэй Качура — з творам Рыгора Барадуліна "Божа, паспагадай усім".

Удзельнікамі праекта сталі кіраўнік МЗС Беларусі Уладзімір Макей і яго намесніца Алена Купчына, намеснік Міністра культуры Васіль Чэрнік, мастацкі кіраўнік ансамбля "Песняры" Вячаслаў Шарапаў, гімнастка Любоў Чаркашына, кіраўнік прэс-службы Міністэрства спорту і турызму Уладзімір Несцяровіч, народная артыстка Беларусі Тацяна Мархель, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч.

СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

# Мастоўскі вандроўнік

**Іна Ганчаровіч**

**Іосіф Лісай аб'ездзіў на ровары ўсю Еўропу, пабываў за Палярным кругам... А ўсе ягоныя падарожжы — гэта прыкладна 25 тысяч кіламетраў.**

Ён — цягавіты, працавіты вясковец з Мастоўскага раёна Гродзеншчыны. Родам з Мікелеўшчыны. Аднак сёння Іосіфа Лісая ведаюць і ў Мастах, і за межамі Беларусі. Выпускнік Брэсцкага педінстытута, тытулаваны спартсмен: ён 12 разоў (!) быў чэмпіёнам Беларусі, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету па поліатлоне. Гэта, нагадаем, такое спартыўнае шматбор'е, у якім трэба добра бегаць, плаваць, страляць, кідаць мяч і гранату, адцiскаца ад зямлі ды падцягвацца на перакладзіне. І ў свае 68 гадоў Іосіф Уладзіміравіч — у цудоўнай спартыўнай форме. Ён настаўнік фізкультуры Правамастоўскай сярэдняй школы, па сумяшчальніцтве — інструктар-метадыст па спорце ў сельгаспрадпрыемстве "Мастаўчанка". Прыхільнік здаровага ладу жыцця, а ў вольны ад працы час — вандроўнік. Прычым галоўныя прынцыпы ў яго вандраваннях: свабода перамяшчэння і максімум уражанняў. Сёння, дарэчы, такіх, як ён, называюць модным словам бэкпекер: чалавек з рукзаком. Бэкпекеры — гэта тыя, хто падарожнічае самастойна, бюджэтна, без тураператараў, зорных атэляў, дарагіх рэстаранаў. Вось і мастоўскі вандроўнік свае працяглыя падарожжы здзяйсняе адзін, з мінімумам выдаткаў, пры тым "усё сваё нясе з сабой".

Яго першая паездка здарылася 24 гады таму: нічога рамантычнага, вырашаў некаторыя фінансавыя праблемы. "У 92-м адпраўіўся на ровары на заробкі ў Польшчу, — успамінае Іосіф Уладзіміравіч. — Перад тым да мяне адтуль прыехаў сваяк. Пабачыўшы маю кухню, пацікавіўся: хто так добра паклаў плітку? Прызнаўся, што сам. А ў яго якраз рамонт у доме — пан і запрасіў мяне, абяцаў добра заплаціць. А тады якраз Саюз разваліўся, у крамах — шаром пакаці, з грашыма на білеты праблемы… Я і паехаў на ровары. Спадабалася! Я і грошай зарабіў, і адпачыў нядрэнна, заадно нагледзеўся такой прыгажосці, што вырашыў тады ж: пачаць падарожнічаць рэгулярна і свядома".



**Іосіф Лісай — дасведчаны велавандроўнік**

Спачатку калясіў па Беларусі, а потым, ацаніўшы сілы, адправіўся далей. Фінляндыя, Швецыя, Нарвегія, Эстонія, Латвія, Літва, Германія, Грэцыя, Англія, Крым... Дарэчы, на паўвостраве пабываў двойчы: у 2006-м і 2013-м. "Спачатку паехаў туды на ровары, але ж там горныя дарогі, ды і "конь" старэнькі, — успамінае Іосіф Уладзіміравіч. — Так што не аб'ехаў я Крым, як планаваў. Вярнуўся туды ў 2013-м: да Джанкоя — цягніком, і потым за 54 дні пешшу абышоў паўвостраў супраць гадзіннікавай стрэлкі. Прайшоў, падлічыў: 684 кіламетры. Уражанні надзвычайныя! Крым — гэта ж зямны шар у мініяцюры! На такім адносна невялікім кавалку сушы змясціліся стэп, перадгор'і, скалы..."

Начуе вандроўнік у маленькім утульным намёце. Харчаванне такое: хлеб, сала, грэчка, рыс і сухафрукты. Вогнішчаў не разводзіць, крупы проста замочвае ў халоднай вадзе гадзін на 5-6. Кажа: не вельмі смачна, але карысна. Вандруе пераважна ў адзіночку. У 2014-м вырашыў паехаць у Нарвегію з сябрам, настаўнікам матэматыкі з Мінска. Разам павандравалі толькі тыдзень: "Усе вандроўцы — вялікія індывідуалісты. Кожны хоча, каб было так, як ён жадае. Вось я люблю палатку на начлег ставіць каля вады, а мой сябар — як мага глыбей у лесе. Я не разводжу вогнішчы — ён любіць гатаваць на агні... Спачатку мы спрачаліся, а потым вырашылі, каб наш адпачынак не ператварыўся ў кашмар, раз'ехацца". Увогуле тую паездку Лісай запомніў надоўга: "Вядома, да кожнага вандравання я рыхтуюся. А тут неяк кінуў справу на самацёк. Я й не думаў, што за Палярным кругам столькі камароў і машкары! Мае вушы праз паўмесяца былі чорныя ад укусаў, разбухлі ды віслі, як у спаніэля".

Слухала я вандроўніка, а ў галаве круцілася: што штурхае яго на такія авантуры? Адкуль сілы бярэ, бо ўзрост жа — не піянерскі… Цікава яшчэ, як ставяцца блізкія да яго такога стылю жыцця? "А ці ведаеце вы, што ровар — гэта цудоўная машына для назапашвання сіл? — нават не задумаўшыся, адказвае Іосіф Уладзіміравіч. — Праца выкладчыка забірае шмат энергіі, да канца навучальнага года я адчуваю: выдыхся. Тады саджуся на ровар — і еду па здароўе. Гэта, паверце, невымоўныя адчуванні сапраўднага жыцця: калі ты вандруеш па бязмежных прасторах, бачыш усю прыгажосць зямлі ды разумееш, што ў гэты момант гэта ўсё належыць табе аднаму. Мой арганізм, нягледзячы на стомленасць, аднаўляецца, вяртаецца да жыцця. Ёсць, праўда, адна цяжкасць: мову англійскую не ведаю... Таму вырашыў вывучаць: яна ж найбольш папулярная ў заходнім свеце. Думаю, яшчэ спатрэбіцца. Што да блізкіх, то яны мяне, пэўна, разумеюць... Наталля, мая жонка, таксама настаўнік фізкультуры. Яна былая спартсменка, гуляла ў валейбол за зборную вобласці, так што мне папярок дарогі не паўстае. Можа і злуецца, але адпускае, нават дапамагае збірацца ў дарогу, толькі просіць быць заўсёды на сувязі".

І напрыканцы — парада мастоўскага вандроўніка Іосіфа Лісая ўсім, хто збіраецца падарожнічаць: "Вялікі італьянскі падарожнік Марка Пола сказаў, што адзін дзень, праведзены ў вандроўцы, каштуе дзесяці гадоў жыцця дома. Таму калі табе цікава рухацца і радавацца таму, што ты бачыш, калі ты любіш прыроду, свет, людзей — тады смела можаш пачынаць свае вандроўкі".

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1935, **Заказ:** 636
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2016